УДК 9(476)

# Нацыянальна-дзяржаўная ідэя у першых Устаўных граматах Беларускай Народнай Рэспублікі

Багдановіч А. Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

18 лютага 1918 года Германія пачала наступленне на ўсход. У выніку гэтага наступлення былі захоплены новыя раёны Беларусі і прыкладна 4/5 тэрыторыі края апынулася у зоне нямецкай акупацыі. Аблвыкамзах і СНК Заходняй вобласці і фронта 19 лютага 1918 года перабраліся ў з Мінску ў Смаленск.

Выканаўчы камітэт Савета з'езда абвясціў сябе вышэйшай уладай на Беларусі і заклікаў насельніцтва да спакою. З гэтай нагоды 21 лютага 1918 года ім была выдадзена Першая Устаўная грамата да народаў Беларусі і створаны першы беларускі нацыянальны ўрад – Народны сакратарыят.

Такім чынам, быў зроблены пачатковы крок на шляху адраджэння беларускай дзяржаўнасці. Хаця фармальна беларуская рэспубліка абвешчана не была.

Наступным крокам у гэтым напрамку стала прыняцце Народным Сакратарыятам Другой Устаўной Граматы 9 сакавіка 1918 года.

Другая Устаўная Грамата абвяшчала Беларусь Народнай Рэспублікай. Выканкам Савета з'езда peраймяноўваўся ў Раду БНР.

У ёй быў сфармуляваны ідэал беларускай дзяржаўнасці. Беларусь бачылася дэмакратычнай прававой рэспублікай з шырокім спектрам правоў і свабод яе грамадзян.

Аднак не гледзячы на ў цэлым прагрэсіўны характар, Другая Устаўная Грамата была ўсё ж такі кампрамісным дакументам. Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай, але нічога не было сказана пра суверэннасць БНР, яе тэрыторыю і адносіны да суседніх дзяржаў.

25 сакавіка 1918 года Рада БНР прымае Трэцюю Устаўную Грамату, якая абвяшчае Беларускую Народную Рэспубліку "незалежнаю і вольнаю дзяржаваю", у якой "самі народы Беларусі ў асобе Установчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных сувязях Беларусі".

Такім чынам, тры дэкларацыі – Першая, Другая і Трэцяя Устаўныя Граматы, развіваючы ідэю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, нарматыўна вызначылі важнейшыя палажэнні аб дзяржаўным і грамадскім ладзе Беларусі, уласнасці на зямлю і яе нетры, тэрыторыі рэспублікі, вярхоўнай заканадаўчай і выканаўчай уладай, правах і свабодах грамадзян, статусе нацыянальных меншасцей.

У сваім спалучэнні граматы даюць уяўленне аб палітычнай пазіцыі прыхільнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння таго часу.